**УДК 378**

# АПІСАННЕ ВЫНІКАЎ НАВУЧАННЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ПАТРАБАВАННЯЎ БАЛОНСКАГА ПРАЦЭСУ

***С. В. Венідзіктаў***
*УА «Магілёўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь»,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*e-mail: venidiktov@institutemvd.by*

Сусветныя тэндэнцыі ў сферы адукацыі сведчаць аб пераходзе ад традыцыйнага падыходу, арыентаванага на выкладчыка, да падыходу, арыентаванага на студэнта. Падобная альтэрнатыўная мадэль факусіруецца не толькі на працэсе выкладання і змесце адукацыйных праграм, але і на тым, якімі навыкамі і прафесійнымі якасцямі, як чакаецца, змогуць авалодаць навучэнцы ў канцы вучэбнага курса. Вынікі навучання з’яўляюцца фармуліроўкамі, якія выкарыстоўваюцца для апісання выніковасці засваення навучальных праграм і факусіруюцца на дасягненнях студэнтаў, а не на змесце навучальнага матэрыялу.

Згодна з патрабаваннямі Балонскага працэсу з 2010 г. усе вучэбныя праграмы і іх асноўныя элементы ва ўстановах вышэйшай адукацыі Еўрапейскага саюза змяшчаюць тэрмін “вынікі навучання”, які ў Еўрапейскай сістэме пераносу і накаплення крэдытаў (European Credit Transfer and Accumulation System — ECTS) азначае “фармуліроўкі таго, што, як прагназіруецца, будзе ведаць, разумець і / ці будзе здольны прадэманстраваць навучэнец пасля завяршэння працэсу навучання” (пераклад наш. — *С. В.*) [1].

Пры апісанні вынікаў навучання традыцыйна выкарыстоўваюцца ідэі, выкладзеныя ў працы Бенджаміна Блюма “Таксанамія адукацыйных задач” [2]. Прапанаваная Блюмам класіфікацыя (катэгарызацыя) разумовых паводзін змяшчае гатовую структуру і спіс паняццяў-дзеясловаў для апісання вынікаў навучання ў такіх галінах, як веды, разуменне, выкарыстанне, аналіз, сінтэз і ацэнка. Гэта так званая кагнітыўная сфера. Дзве іншыя найважнейшыя сферы — афектыўная (адносіны, пачуцці, каштоўнасці) і псіхаматорная (фізічныя навыкі).

Згодна з патрабаваннямі Балонскага працэсу вынікам навучання надаецца першасная ўвага пры вызначэнні асноўных напрамкаў развіцця адукацыйнай прасторы [3], сярод якіх:

1) прыняцце сістэмы супастаўляльных ступеней (выкарыстанне вынікаў навучання як агульнай мовы для апісання кваліфікацый дапамагае зрабіць гэтыя кваліфікацыі больш зразумелымі для іншых устаноў адукацыі і работадаўцаў);

2) садзейнічанне мабільнасці (вынікі навучання дазваляюць зрабіць кваліфікацыі больш празрыстымі, што спрашчае акадэмічныя абмены);

3) стварэнне сістэмы крэдытаў (сістэма ECTS [1] з сістэмы прызнання перыядаў навучання ў замежных установах эвалюцыяніравала ў сістэму пераносу і накаплення крэдытаў, якая ахоплівае ўсю сферу адукацыі, а не толькі навучанне ў іншых краінах. Крэдыты, адлюстраваныя ў выніках навучання, з’яўляюцца эфектыўным сродкам прызнання і колькаснай ацэнкі вучэбных дасягненняў, забяспечваючы эфектыўную структуру для суаднясення кваліфікацый);

4) супрацоўніцтва ў галіне забеспячэння якасці (выкарыстанне вынікаў навучання як агульнага метаду для апісання праграм і модуляў дапамагае ўсталяванню агульных стандартаў і метадаў забеспячэння якасці адукацыі ў навучальных установах);

5) развіццё еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (выкарыстанне ў вучэбнай дакументацыі агульных падыходаў да вынікаў навучання значна спрашчае распрацоўку і інтэграцыю навучальных праграм);

6) адукацыя на працягу ўсяго жыцця (выкарыстанне сістэмы крэдытаў, звязанай з вынікамі навучання, накіравана на стварэнне мабільнай комплекснай сістэмы, якая спрашчае атрыманне адукацыйных кваліфікацый, незалежна ад узросту);

7) арыентацыя на патрэбы навучэнцаў (выкарыстанне вынікаў навучання пры апісанні навучальных курсаў дазваляе студэнтам дакладна разумець, на што менавіта накіравана навучанне, як яно звязана з абранай прафесіяй; таксама дапамагае студэнтам у выбары навучальных курсаў, спрыяе падтрымцы студэнтаарыентаванага навучання).

Дыскусійным пытаннем застаюцца суадносіны вынікаў навучання з паняццямі мэты і задач адукацыйнага працэсу. Мэта навучальнай дысцыпліны (модуля) — гэта шырокая агульная фармуліроўка навучальных намераў педагога, якая паказвае, што менавіта ён плануе ахапіць падчас навучання. Звычайна мэты апісваюцца з пункта гледжання выкладчыка для таго, каб паказаць агульны змест і накіраванасць навучання. Напрыклад, мэтай дысцыпліны “Рыторыка” ў навучальным працэсе Магілёўскага інстытута МУС з’яўляецца стварэнне тэарэтычных і метадалагічных асноў авалодання курсантамі ведамі, уменнямі і навыкамі ў галіне маўленчых камунікацый [4]. Задача навучальнага курса — гэта, як правіла, канкрэтная фармуліроўка навучальных намераў, што адносіцца да адной з канкрэтных галін, якую выкладчык мае намер ахапіць у працэсе навучання. Напрыклад, адной з задач дысцыпліны “Рыторыка” з’яўляецца авалоданне майстэрствам публічнага выступлення [4]. Такім чынам, мэта вывучэння дысцыпліны азначае агульны

навучальны намер, у той час як задача дае больш канкрэтную інфармацыю аб тым, што менавіта плануецца дасягнуць у працэсе выкладання.

У сувязі з вынікамі навучання нярэдка выкарыстоўваецца і тэрмін "кампетэнцыя". Паколькі адзінае яго разуменне ў літаратуры адсутнічае, у кантэксце Балонскага працэсу вынікі навучання атрымалі большае распаўсюджванне. У даследаваннях, дзе падаецца мноства практычных падыходаў да апісання вынікаў навучання [5; 6], змяшчаецца агульная рэкамендацыя: вынікі павінны выяўляцца ў простых і адназначных тэрмінах і быць зразумелымі студэнтам, выкладчыкам, работадаўцам і знешнім экспертам.

Пры вызначэнні вынікаў навучання для дысцыпліны варта адзначыць мінімальны прымальны ўзровень, які дазваляе студэнту атрымаць заліковы бал, у сувязі з чым больш прадуктыўна зрабіць невялікі пералік найважнейшых вынікаў, чым мноства другасных. У літаратуры даюцца рэкамендацыі адносна колькасці вынікаў навучання для адной дысцыпліны. Так, напрыклад, Дж. Мун лічыць аптымальным восем вынікаў: "Калі колькасць вынікаў навучання для курса перавышае дзесяць, то яны, хутчэй за ўсё, вызначаюць занадта шмат дэталей вучэбнай праграмы і будуць цяжка паддавацца ацэньванню" (пераклад наш. — *С. В.*) [6]. Дж. Бінэм мяркуе, што мэтазгодна фармуляваць ад пяці да дзевяці вынікаў навучання [5]. Відавочна, што колькасць вынікаў навучання залежыць ад аб'ёму і задач канкрэтнай дысцыпліны.

Адзначым таксама адзін з найбольш важных практычных момантаў: вынікі навучання з'яўляюцца не проста "спісам пажаданняў" выкладчыка адносна таго, што студэнт павінен быць у стане рабіць пасля засваення вучэбнай дысцыпліны, — вынікі павінны быць даступна апісанымі і простымі для дыягностыкі. У практычных рэкамендацыях па фармуліроўцы вынікаў навучання Х. Фрай [7] прапануе выкарыстоўваць адназначныя дзеясловы дзеяння, прыводзячы шматлікія прыклады з таксанаміі Блюма [2]. Каб паказаць адрозненні ў тэрмінах, якія выкарыстоўваюцца для апісання вынікаў, аўтар прыводзіць спіс дзеясловаў (табліца 1 [7, с. 51]).

Табліца 1 — **Прыклады дзеясловаў, што выкарыстоўваюцца для апісання мэты і задач навучання**

| *Мэты* | *Вынікі* |
|---|---|
| Ведаць | Адрозніваць |
| Разумець | Выбіраць |
| Вызначаць | Збіраць |
| Ацэньваць | Карэкціраваць |
| Засвоіць | Устанавіць |
| Пазнаёміцца | Ужываць |

Пры фармуліраванні вынікаў навучання карыснымі, на наш погляд, з’яўляюцца наступныя рэкамендацыі:

1) кожны вынік навучання павінен пачынацца з дзеяслова дзеяння, за якім павінна ісці фраза, якая апісвае кантэкст;

2) варта выкарыстоўваць толькі адзін дзеяслоў для кожнага выніку навучання;

3) неабходна пазбягаць выкарыстання неадназначных тэрмінаў (напрыклад, “ведаць”, “разумець”, “вучыць” “пазнаёміцца”, “быць інфармаваным”, “быць у курсе” і інш.): гэтыя тэрміны адносяцца да вучэбных задач, а не да вынікаў навучання;

4) трэба пазбягаць складаных сказаў (у выпадку неабходнасці для большай яснасці выкарыстоўваць больш за адзін сказ);

5) вынікі навучання павінны быць даступнымі да вымярэння;

6) атрыманыя вынікі павінны паддавацца аб’ектыўнай ацэнцы (калі вынікі будуць занадта агульнымі, іх эфектыўнае ацэньванне выклікае цяжкасці);

7) неабходна памятаць аб рэсурсе часу, на працягу якога трэба дасягнуць вынікаў навучання (ці рэальна дасягнуць жаданых вынікаў з наяўнымі рэсурсамі і часам?);

8) пры вызначэнні вынікаў навучання для студэнтаў пасля першага года навучання нельга перагружаць спіс тэрмінамі з ніжняй часткі таксанаміі Блюма [2] (напрыклад, замест “ведання і разумення” агульных заканамернасцяў мэтазгодна ўключыць “выкарыстанне, аналіз, сінтэз і ацэнку”).

Нягледзячы на пэўную крытыку падобнай методыкі планавання адукацыйнага працэсу ў дзяржавах – удзельніцах Балонскага працэсу, падыход да выкладання на аснове вынікаў навучання атрымаў сур’ёзную падтрымку на міжнародным узроўні. Так, напрыклад, А. Джэнкінс і Д. Анвін [8] лічаць, што вынікі навучання: а) дапамагаюць выкладчыкам больш дакладна данесці да студэнтаў мэту і задачы навучальных дысцыплін; б) дапамагаюць студэнтам вучыцца больш эфектыўна (вучэбная праграма становіцца для іх больш адкрытай і зразумелай); в) дапамагаюць педагогам больш эфектыўна распрацоўваць вучэбна-метадычныя матэрыялы; г) дапамагаюць педагогам выбраць стратэгію выкладання і форму аўдыторных заняткаў (напрыклад, лекцыя, семінар, практычныя заняткі, кансультацыя, дыскусія, прэзентацыя, лабараторная работа), якая найбольш поўна адпавядае прагназуемым вынікам навучання; д) робяць зразумелым для навучэнцаў змест асобных вучэбных заняткаў; е) арыентуюцца на больш дакладную дыягностыку выніковасці навучання падчас бягучай або выніковай атэстацыі [8].

Такім чынам, апісанне вынікаў навучання накіравана на рэалізацыю асноўных прынцыпаў Балонскага працэсу, забяспечваючы: а) вычарпальнае і

дакладнае апісанне набываемых прафесійных кампетэнцый; б) атрыманне навучэнцамі інфармацыі, неабходнай для ўсвядомленага выбару вучэбнага модулю / дысцыпліны і арганізацыі самастойнай работы; в) прадстаўленне работадаўцам карэктнай інфармацыі аб кваліфікацыі выпускніка навучальнай установы; г) акадэмічную мабільнасць, прызнанне кваліфікацый; д) эфектыўнае функцыянаванне сістэмы акадэмічных крэдытаў; д) уніфікацыю адукацыйных стандартаў і ўзаемадзеянне розных адукацыйных сістэм.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. European Credit Transfer and Accumulation System (ECTS) [Electronic resource] // European Commission. – Mode of access: https://ec.europa.eu/education/resources-and-tools/european-credit-transfer-and-accumulation-system-ects_en. – Date of access: 04.05.2019. Вернуться к статье

2. Бактыбаев, Ж. Ш. Использование технологии таксономии Блума в учебном процессе вуза / Ж. Ш. Бактыбаев // Ярослав. пед. вестн. – 2017. – № 1. – С. 150–153. Вернуться к статье

3. The European Higher Education Area in 2018. Bologna Process Implementation Report [Electronic resource] // European Commission. – Mode of access: https://eacea.ec.europa.eu/national-policies/eurydice/sites/eurydice/files/bologna_internet_0.pdf. – Date of access: 04.05.2019. Вернуться к статье

4. Венидиктов, С. В. Риторика. Учебная программа учреждения высшего образования по учебной дисциплине для специальностей 1-93 01 01 Правовое обеспечение общественной безопасности, 1-93 01 03 Правовое обеспечение оперативно-розыскной деятельности [Электронный ресурс] / С. В. Венидиктов // Могилев. ин-т МВД. – Режим доступа: http://www.institutemvd.by/images/materials/sgd_kafedra/Uchebno-metod_mater/Ritorika/Ritorika_1-93_01_01_03.pdf. – Дата доступа: 04.05.2019. Вернуться к статье

5. Bingham, J. Guide to Developing Learning Outcomes. The Learning and Teaching / J. Bingham. – Sheffield : Sheffield Hallam University, 1999. – 124 p. Вернуться к статье

6. Moon, J. The Module and Programme Development Handbook / J. Moon. – London : Kogan Page Limited, 2002. – 198 p. Вернуться к статье

7. Fry, H. A Handbook for Teaching and Learning in Higher Education / H. Fry, S. Ketteridge, S. Marshall. – London : Kogan Page, 2003. – 449 p. Вернуться к статье

8. Jenkins, A. How to Write Learning Outcomes [Electronic resource] / A. Jenkins, D. Unwin // The University of Baltimore. – Mode of access: https://www.ubalt.edu/cas/faculty/faculty-matters/How%20to%20write%20student%20learning%20outcomes.pdf. – Date of access: 04.05.2019. Вернуться к статье